Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па навуковай рабоце
БДУКМ
__________В.Р. Языковіч
“29” чэрвеня 2019 г.
Рэгістрацыйны № ВД-145/эвуч.

# ЭТЫКЕТ І КУЛЬТУРА БЫТУ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:*
*1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках),*
*1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках),*
*1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2019

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі ОСВО 1-21-04 01 -2013 па спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках) і вучэбных планаў па спецыялізацыям рэг. № Д21-1-70/17 вуч.; Д21-1-69/17 вуч.; Д21-1-71/17 вуч.; Д21-1-73/17 вуч.

**СКЛАДАЛЬНІК**

*Л.К. Кухто*, прафесар кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат культуралогіі, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Ю.А. Яроцкая,* кандыдат культуралогіі, дзяржаўны судовы эксперт аддзела культуралагічных экспертыз упраўлення складаных судова-псіхіятрычных экспертыз галоўнага ўпраўлення судова-псіхіятрычных экспертыз Рэспублікі Беларусь

*І.І. Бадунова,* кандыдат культуралогіі, дацент кафедры харэаграфіі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 11 ад 17.04.2019);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 5 ад 12.06.2019)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за выпуск: *Л. К. Кухто*

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

На сучасным этапе развіцця грамадства ва усім свеце адчуваецця высокая зацікаўленнасць да этыкету. Новыя перспектывы яго вывучэння адкрыліся дзякуючы прымяненню новых падыходаў даследаванняў, аналізу камунікацыі і паводзін. Рост зацікаўленнасці да пытанняў этыкету ў значнай ступені можна растлумачыць і новым асэнсаваннем саміх феноменаў зносін і паводзін. Сёння правілы чалавечага існавання асноўваюцца на распаўсюджванні ўніверсальных норм паводзін, якія дапамагаюць наладжваць добразычлівыя адносіны паміж людзьмі ў працэсе міжкультурнай камунікацыі. Прытрымліванне правіл этыкету набывае асобы сэнс у міжнародных адносінах, так як кожная дзяржава мае свае асаблівасці гістарычнага развіцця і культурных традыцый.

Этыкетная культура мае свае законы, якія патрэбна ведаць. Па гэтай прычыне ў цяперашні час этыкетная культура вывучаецда ва ўсіх вышэйшых навучальных установах свету. Прытрымліваюцца гэтага кірунку і навучальныя ўстановы нашай краіны. Веданне і правільнае выкарыстанне правіл этыкету дапамагае сённяшнім студэнтам, а заўтрашнім спецыялістам дасягнуць значных поспехаў у сферы ўсталявання добразычлівых узаемаадносін з блізкімі, калегамі па вучобе і працы, пры інтэграцыі ў сусветную сістэму міжнародных сувязей.

«Этыкет і культура быту» з'яўляецца неад'емнай часткай сацыяльна-гуманітарных дысцыплін і адыгрывае важную ролю ў фарміраванні прафесійнай кампетэнцыі выкладчыкаў і даследчыкаў культурных працэсаў і з'яў. Распрацоўка вучэбнай дысцыпліны выклікана сучаснымі патрэбамі ў высокакваліфікаваных спецыялістах, якія будуць здольнымі спалучаць спецыяльныя веды з шырокім колам экзістэнцыяльных каштоўнасцей, нормамі маралі і эстэтычнымі поглядамі. Дадзеная вучэбная дысцыпліна распрацаваны з улікам тэарэтычных дасягненняў культуралогіі, гісторыі, этналогіі, этнаграфіі і сумежных дысцыплін. Выкладанне дадзенага вучэбнага курса вядзецца з улікам ведаў студэнтаў, атрыманых у межах ад высокіх цырыманіяльных актаў і міждзяржаўных сувязей да звычайных правіл паводзін і зносін на рабоце і ў быце.

У працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнты знаёмяцца з гістарычнымі і мастацкімі прыкладамі этыкетнай культуры, звяртаюць увагу на нацыянальны характар і асаблівасці культуры быту, разглядаюць перспектывы адраджэння навукі разважнасці і абыходжання з людзьмі і рэчамі ў нашым жыцці. Усе настаўленні па этыкеце добра запамінаюцца і ў студэнтаў узнікае жаданне выкарыстоўваць іх на практыцы.

*Мэта вучэбнай дысцыпліны* – фарміраванне сістэмы ведаў аб этыкетных нормах і правілах паводзін у соцыуме, азнаямленне студэнтаў з ідэямі і ўзорамі этыкетнасці, арыентацыя інтэлектуальнага густу на лепшыя культурныя дасягненні, фарміраванне уменняў выглядаць прыстойна і адчуваць сябе ўпэўнена ў розных жыццёвых сітуацыях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Задачы вучэбнай дысцыпліны:*

– сфарміраваць у студэнтаў сістэмныя веды аб вытоках і эвалюцыі этыкету і культуры быту;

– навучыць майстэрству прыгожых і рэзультатыўных зносін з соцыумам;

– сфарміраваць правілы і ўменні тактоўных адносін да іншых асоб;

– навучыць выбіраць патрэбную формулу этыкетных паводзін з улікам канкрэтнай сітуацыі.

У выніку вывучэння дадзенага курса студэнты павінны *ведаць:*

– асноўныя паняцці і канцэпты этыкету;

– адметныя гістарычныя рысы правіл паводзін і культуры быту;

– тэарэтычныя асновы этыкетнай культуры;

– асаблівасці этнаэтыкету;

– формы этыкетных паводзін з улікам абставін зносін;

– нормы і патрабаванні сучаснага этыкету і этыкетнай субардынацыі.

*Умець* характарызаваць і аналізаваць:

– этыкетныя правілы, нормы, асаблівасці культуры быту на розных гістарычных этапах развіцця грамадства;

– семіятычныя, камунікатыўныя і паводзінскія асновы этыкетнай культуры;

– нацыянальна-культурную спецыфіку этыкету;

– спецыфіку сучасных этыкетных патрабаванняў.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыплніы “Этыкет і культуры быту” студэнт павінен развіць наступныя *акадэмічныя кампетэнцыі*:

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі ў галіне культуралогіі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам да вырашэння праблем.

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу свайго жыцця.

АК-10. Валодаць метадычнымі ведамі і даследчымі ўменнямі, якія забяспечваюць вырашэнне задач інавацыйна-метадычнай і навукова-даследчай дзейнасці ў галіне культуралогіі.

Студэнт павінен развіць наступныя *сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:*

САК-1. Ведаць і выкарыстоўваць сацыяльныя і маральна-этычныя нормы ў асобаснай і сацыяльна-прафесійнай жыццядзейнасці.

САК-2. Валодаць каммунікатыўнымі здольнасцямі для работы ў міждысцыплінарным і міжнародным асяроддзі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

САК-3. Пазітыўна адносіцца да традыцый і навацый у нацыянальнай і іншых культурах.

САК-4. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

САК-5. З павагай і беражна ставіцца да гістарычнай спадчыны, талерантна ўспрымаць сацыяльныя і культурныя адрозненні.

САК-6. Успрымаць і пераасэнсоўваць каштоўнасці, нормы, артэфакты культуры іншых супольнасцей.

САК-7. Удасканальваць і развіваць духоўны і інтэлектаульны ўзровень, дамагацца маральнага і фізічнага ўдасканалення сваёй асобы.

Акрамя таго студэнт павінен набыць наступныя *прафесіянальныя кампетэнцыі:*

*арганізацыйна–кіраўніцкая дзейнасць:*

ПК-1. Прагназаваць, планаваць і арганізоўваць кіраўніцкую дзейнасць.

ПК-2. Выкарыстоўваць нарматыўна-прававую базу галіны культуры.

ПК-3. Рэалізоўваць агульнадзяржаўныя, рэгіянальныя і ведамасныя праграмы і праекты ў галіне культуры і мастацтваў.

ПК-4. Арганізоўваць сваю працу на навуковай аснове, валодаць камп'ютарнымі метадамі збору, захавання і апрацоўкі інфармацыі ў сферы прафесійнай дзейнасці.

ПК-5. Далучаць розныя групы насельніцтва і асобных індывідаў да працэсу стварэння, засваення, збераджэння і распаўсюджання каштоўнасцей культуры.

*навукова–даследчая дзейнасць:*

ПК-7. Кваліфікавана складаць планы, фармуляваць і вырашаць задачы у працэсе навукова-дасдедчай дзейнасці.

ПК-8. Збіраць,аналізаваць і сістэматызаваць тэарэтычны матэрыял;

ПК-9. Распрацоўваць методыку даследаванняў, апрацоўваць матэрыялы і на іх аснове рабіць навукова абгрунтаваныя высновы.

ПК-9. Рыхтаваць навуковыя даклады на канферэнцыі і артыкулы ў часопісы.

*педагагічная дзейнасць:*

ПК-10. Ведаць сучасныя адукацыйныя тэхналогіі і выкарыстоўваць іх ў вучэбна–выхаваўчым працэсе;

ПК-11. Творча прымяняць атрыманыя веды і набытыя навыкі ў прафесійнай дзейнасці;

ПК-12. Кіраваць самастойнай работай студэнтаў, арганізоўваць іх вучэбны працэс;

*інавацыйная дзейнасць:*

ПК-13. Ацэньваць стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця грамадства і культуры;

ПК-14. Асвойваць і выкарыстоўваць сучасныя адукацыйныя тэхналогіі і педагагічныя інавацыі.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны ажыццяўляецца ў форме лекцый, якія з'яўляюцца асновай тэарэтычнай падрыхтоўкі студэнтаў і стымулююць актыўную пазнавальную дзейнасць. Семінарскія заняткі праводзяцца з мэтай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паглыблення і расшырэння ведаў, атрыманых на лекцыях, а таксама ў ходзе самастойнага вывучэння матэрыялу.

*Метады (тэхналогіі) навучання*

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца: тэхналогіі праблемна-модульнага навучання; тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; праектныя тэхналогіі; камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, прэс-канферэнцыі, вучэбныя дэбаты і іншыя актыўныя формы і метады); метад аналізу канкрэтных сітуацый; гульнявыя тэхналогіі, у межах якіх студэнты ўдзельнічаюць у дзелавых, ролевых, імітацыйных гульнях і інш.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У мэтах фарміравання сучаснай сацыяльна-асобаснай і сацыяльна-прафесійнай кампетэнцыі выпускніка ВНУ ў практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Этыкет і культура быту» ўсяго прадугледжана 52 гадзіны, з якіх аўдыторных заняткаў 34 гадзіны. Прыкладнае размеркаванне гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 20, семінары –14, (дзённае аддзяленне). Завочнае навучанне: лекцыі – 6, семінары – 2.

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – залік, экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### *Уводзіны*

Значэнне дысцыпліны Этыкет і культура быту" ў працэсе падрыхтоўкі выкладчыкаў і даследчыкаў культуралагічных праблем. Прадмет, змест, структура вучэбнага курса. Між- прадметныя сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі. Віды вучэбных заняткаў, крыніцы і літаратура.

Этыкетная культура як састаўная частка знешняй культуры чалавека і грамадства. Этыкет як сукупнасць правіл паводзін, якія рэгулююць знешнія праявы чалавечых узаемаадносін. Асноўныя напрамкі этыкетнай адукацыі. Тэарэтычныя веды этыкету як залог паспяховага практычнага вопыту. Этыкет аб правілах абыходжання і паводзін, навучанні функцыянальнай пісьменнасці, сур'ёзных адносінах да любога мерапрыемства, ўменні весці дыялог. Этыкетная культура як аснова правільнага выказвання розных пунктаў гледжання, граматнага выкарыстання паняццяў і тэрмінаў, захавання добразычлівага тону, спакою духа і ўмення абараняць свае ідэалы і перавагі. Этыкетная культура і яе асноўныя фактары: гуманістычныя ідэалы; патрабаванні ў развіцці і ўдасканаленні сацыяльна-маральных адносін; імкненне да сцвярджэння прыгажосці паўсядзённага жыцця, яе рытму і ўпарадкавання.

### *Тэма 1. Этыкет у краінах Пярэдняй Азіі і Старажытнага Егіпта*

Асаблівасці этыкетнай культуры Шумера, Асірыі і Вавілона. "Эпос о Гильгамеше" - як адзін са старэйшых мастацка-філасофскіх твораў. Знешні выгляд як маральная прыкмета. Адзенне і статус. Фарміраванне будучых правіл прыстойнасці. Рытуал як аснова паводзін у Старажытным Егіпце. "Поучения Кагемни фараону Снофри" - аб карысці правіл прыстойнасці. "Наставления начальника города и визиря Птаххотена" - пра настаўленні моладзі. Роля прыроды на стыль паводзін, фасоны адзення, знешняе аблічча чалавека. Фараон і рэгламентаваны цырыманіял. Сакральны сэнс і сімвалізм як аснова дзейнасці фараона. Рытуалізацыя паўсядзённага жыцця. Асаблівасці этыкету прыватнага жыцця егіпцян. Этыкет прыёму гасцей.

### *Тэма 2. Этыкет Антычнай эпохі*

Старажытная Грэцыя - таварыства роўных. Рэгуляванне норм этыкету супольнасцю роўных людзей у Старажытнай Грэцыі. Паўсядзённае жыццё і этыкет. Мараль і этыкет. "Пір" Платона як адно з адлюстраванняў этыкетнай культуры. Асаблівыя правілы прыстойнасці ў Старажытнай Грэцыі (Гамер, Піфагор, Сакрат, Дэмакрыт, Фалес). Прынцып "золотой середины" і паняцце "калокагатии". Прафесійны этыкет. Парушэнне этыкету.

Старажытны Рым - этыкет Імперыі. Маральныя і эстэтычныя нормы Старажытнага Рыма. Этыкетныя настаўленні Авідзія ("Искусство любви"). Этыкет застолля, прыёму гасцей, штодзённых паводзін. Ювенал аб праблеме паводзін чалавека. Знакавая "мова" адзення. Гарацый аб этыкеце адзення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Знешні выгляд і аблічча рымляніна. Правілы прыстойнасці для дзяцей і жанчын.

### *Тэма 3. Знакі і жэсты Сярэднявечча*

Сярэднявечча як свет знакаў. Л.М.Баткін аб еўрапейскім грамадстве эпохі Сярэднявечча. Іерархічная лесвіца грамадства - фундамент свецкага этыкету. Сімволіка поз, жэстаў, прадметаў. Асаблівасці этыкету ранняга Сярэднявечча. А.Я.Гурэвіч аб асаблівасцях этыкетнай культуры. Росквіт Сярэднявечча. Этыкет рыцарства. Пэдра Альфонса "Дисциплина клерикалис" - першы дапаможнік па паводзінах. Трактаты аб правілах паводзін: Рабэр дэ Блуа "О целомудрии женщин", "Хороший тон для дам", Франчэска дэ Барберына "Предписания любви", "Правила поведения и нравы сеньоров". Асаблівасці аддзення эпохі Сярэднявечча. Асаблівасці штодзённага этыкету. Этыкет прыёму гасцей. Закат Сярэднявечча. Й.Хёйзінга "Осень Средневековья".

### *Тэма 4. Еўрапейскі этыкет XVI-XIX стст.*

Галоўныя каштоўнасці і разумение гонару ў іспанскім грамадстве. Бальтазар Грасіян і "Карманный оракул или Наука благоразумия". Прыдворны этыкет Іспаніі. Маньерызм як літаратурна-мастацкі стыль і яго ўплыў на іспанскі двор, норавы, грамадства і моду. Асаблівасці правядзення вольнага часу пры іспанскім двары. Адзенне Іспаніі як узор для Еўропы. Асаблівасці этыкетнай культуры ў гарадах.

Францыя як узор этыкету і заканадавец моды ў Еўропе XVI-XVIII стст. Асаблівасці прыдворнага этыкету, знешняга вобліку, адзення. Свецкія правілы этыкету, правілы паводзін для жанчыны. Застольны этыкет. "Галантнае стагоддзе" ў французскай гісторыі.

Этыкет Віктарыянскай эпохі. Традыцыяналізм - аснова англійскай этыкетнай культуры. Асаблівасці паводзін пры двары каралевы Вікторыі. Дрэс-код джэнтльменаў. Распарадак жыцця ў англійскіх сем'ях. Дэндзізм як самавыяўленне англійскай моладзі.

Філіп Дормер Стэнхап "Письма к сыну" - звод педагагічных, этыкетных настаўленняў і рэкамендацый, "образец эпистолярной прозы XVIII века и искренний человеческий документ". Асноўныя правілы "Омнибусного закона". Грамадства і вольны час.

Хрысціянскае веравучэнне і этыкетная культура. Асноўныя прынцыпы хрысціянскай маралі. Патрабаванні да адзення і знешняга выгляду ў рускім праваслаўі. "Поучения" Ула- дзіміра Манамаха. Дыпламатычны этыкет на Русі. Царскія піры, паўсядзённы этыкет, правілы прыёму гасцей. Этыкет і прымхі. Асаблівасці этыкету эпохі Пятроўскіх рэформ.

### *Тэма 5. Этыкет савецкага грамадства*

Зараджэнне новых правіл і норм этыкету ў савецкую эпоху. Роля ідэалагічных установак Савецкай краіны ў фарміраванні этыкетнай культуры. Прапаганда безэтыкетнасці, антыэтыкетнасці. Усталяванне новага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

камуністычнага быту. Асаблівасці этыкету сямейных адносін. Мужчына і жанчына ў новым грамадстве. Работа па выхаванні культуры паводзін народнымі дамамі і клубамі. Гутарковы этыкет савецкай эпохі. Уяўленні аб дзелавым этыкеце. Дрэс-код савецкага часу. Фарміраванне новага слоя савецкай эліты і адраджэнне элементаў старога этыкету. 1950-1970-я гг. як час канчатковага фарміравання адзінага савецкага этыкету. Трансфармацыя савецкага этыкету ў дэмакратычны еўрапейскі.

### *Тэма 6. Беларускі этыкет*

Беларускі этыкет як аблічча народа. Звычаі і абрады як форма рэгуляцыі этыкетных паводзін. Сінкрэтычнае спалучэнне язычніцкіх традыцый і хрысціянскіх догм у грамадскім быце. Полісацыяльны і субсацыяльны грамадскі быт.

Сям'я як мікрасацыяльная адзінка, асноўныя формы. Рэгламентацыя сямейна-бытавых адносін у сям'і (юрыдычныя нормы і няпісанае звычаёвае права). Залежнасць характару ўзаемаадносін паміж членамі сям'і ад яе формы. Становішча мужчыны і жанчыны ў сям'і. Статус мужчыны і жанчыны ў сям'і. Сямейна-бытавая абраднасць і нормы этыкету ў XIX - пачатку XX ст. Традыцыі каляндарнай абраднасці і этыкет (Нараджэнне Хрыстова, Вадохрышча, Масленіца, Вялікі Пост, Вялікдзень, Іванаў дзень (Купалле)). Фарміраванне ўнутрысямейных адносін на раўнапраўнай аснове.

Традыцыйныя формы і метады сямейнага выхавання дзяцей. Прыклад бацькоў як важнейшы педагагічны фактар. Няпісаныя правілы і афіцыйнае права ў сістэме выхавання. Саслоўная дэтэрмінаванасць паводзін дзяцей. Роля працоўнай дзейнасці ў выхаванні. Роля духоўных каштоўнасцей у працэсе выхавання. Асаблівасці дзіцячага побыту. Дзеці ў вераваннях і абрадах.

Унутрыэтнічныя і саслоўна дэтэрмінаваныя адрозненні ў адзенні. Традыцыі і навацыі беларускага народнага касцюма.

Традыцыйная кухня беларусаў. Залежнасць асартыменту прадуктаў харчавання ад саслоўна-класавага і маёмаснага становішча людзей.

### *Тэма* 7. ***Этыкет краін Усходу***

Японія: паміж этыкетам і этыкай. Характэрныя рысы японскага этыкету як сінтэз сінтаіскага, будыйскага і канфуцыянскага вучэнняў. Дысцыпліна і непахіснасць сямейных адносін - аснова маральнага выхавання. Сацыяльная іерархія і традыцыйныя прынцыпы ўзаемаадносін у японскім грамадстве. Асаблівасці японскай гасціннасці. Звяртанні і дзелавы этыкет. Этыкетныя паводзіны самураяў.

Вучэнне Канфуцыя як уяўленне аб становішчы чалавека ў грамадстве і яго абавязках. Паняцце "лі" - этыкет, цырыманіял, рытуал, абрад, звычай. Канфуцыянская мадэль "ідэальнага чалавека". Выхаванне сумленнасці, павагі да старэйшых, ветлівасці і самаўдасканалення як асноўных прынцыпаў канфуцыянства. Кітайскія цырымоніі. Сяброўства і гасціннасць у сістэме кітайскага грамадства. Жанчыны і адносіны ў сям'і. Рэгламентацыі ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адзенні. Асноўныя палажэнні будызму. Сацыякультурныя традыцыі будызму. Будызм і этыкетная культура.

Этыкет у арабскім свеце. Адметнасць ісламскай цывілізацыі. Уплыў ідэалогіі мусульманская рэлігіі на жыццё чалавека. Іслам як паводзінскі кодэкс мусульман. Дазволенае і забароненае ў ісламе. Ужыванне экспрэсіўных сродкаў мовы пры зносінах. Аб'яднанне каштоўнасцей ісламу і бедуінскага грамадства як аснова этыкету арабскага свету. Арабы як прадстаўнікі "поліактыўнага тыпу культур". Агульныя правілы і нормы арабскага бізнес-этыкету.

### *Тэма 8. Амерыканскі этыкет*

Амерыканскі этыкет як уласная сістэма правіл ветлівасці і добрых манер. Роля ўлады і царквы ў фарміраванні правіл этыкету. Разважанні аб правілах паводзін Б.Франкліна ("Бедный Ричард"). Тэрытарыяльныя адрозненні ў правілах этыкету паміж Поўднем і Поўначчу. Уплыў сацыяльнага этыкету Старога Свету на амерыканскі этыкет. Дж.Вашынгтон і "Правила приличного поведения". XIX ст. як новы этап у фарміраванні амерыканскіх правіл паводзін. Сумленнасць, сціпласць, смеласць як галоўныя якасці выхаванага амерыканца. Этыкетныя патрабаванні да жанчыны. Асаблівасці этыкету пе- рыяду "неумеренного потребления", арыентацыя на арыстакратызм. Асноўныя тэндэнцыі ў фарміраванні правіл этыкету ў XX ст. Новы позірк на этыкетныя правілы ў XXI ст. Кантынентальныя і амерыканскія правілы этыкету: агульнае і асаблівае. Індывідуальная свабода як найвышэйшая амерыканская каштоўнасць.

### *Тэма 9. Сучаснасць і этыкет*

Асноўныя паняцці сучаснага этыкету (ветлівасць, добры нораў, добрыя манеры, шчырасць, тактоўнасць). Сучасны этыкет як адлюстраванне працэсаў дэмакратызацыі і гуманізацыі сацыяльнага жыцця. Этыка і этыкет. Мараль і этыкет. Манера паводзін як адлюстраванне ўнутранай культуры чалавека, яго маральных і інтэлектуальных якасцей. Узаемасувязь умення правільна паводзіць сябе і ўстанаўлення асабістых і дзелавых кантактаў, дасягнення ўзаемаразумення, стварэння ўстойлівых узаемаадносін.

### *Тэма 10. Семіятычны аспект этыкету*

Паходжанне і распаўсюджванне паняцця "этыкет". Вызначэнне этыкету рознымі даследчыкамі (У.Даль, Т.Ціўян, А.Байбурын, А.Тапаркоў). Этыкет як пэўная сістэма знакаў, сімвалаў і ўстановак. Этыкетныя знакі як схематычная кадзіроўка элементаў чалавечага вопыту, фактаў рэчаіснасці. Функцыі этыкетных знакаў: ідэнтыфікацыі (з іменем, этыкетнымі фактамі, актамі); перцэптыўная (успрыманне знака ўдзельнікамі этыкетных дзеянняў); дыстыктыўная (адрозніваючая: свой - чужы, мужчына - жанчына); азначальная (урач, журналіст, настаўнік); камунікатыўна-прагматычная (уздзеянне знака на ўдзельнікаў этыкету - напружанасць, абыякавасць, пратэст). Ч.Пірс аб асноўных функцыях знака. Сімвал як вобраз, які



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адлюстроўвае розныя ўспрыманні і адносіны. Выкарыстанне знакаў у этыкетных узаемадзеяннях.

### *Тэма 11. Камунікатыўны аспект этыкету*

Камунікацыя як сэнсавы акт сацыяльнага ўзаемадзеяння. Рэалізацыя кіраўніцкай, інфармацыйнай, фатычнай (звязаная з усталяваннем кантактаў) функцыі ў камунікатыўных актах і ўсталяванне адпаведных этыкетных адносін. Ажыццяўленне кіраўніцкіх актаў з дапамогай загаду, пераканання, просьбы, інфармавання, узбуджэння, стымулявання. Стымуляванне ўвагі і памяці, пераканане і ўзбуджэнне ў фатычных узаемадзеяннях. Публічныя, інтымныя, масавыя, групавыя, асабістыя, грамадскія этыкетныя акты. Улік зместу, формы і гісторыі пры вывучэнні камунікатыўнага аспекту этыкету. Спецыфіка ролевай структуры камунікатыўных сітуацый у традыцыйных культурах. Гутарка і культура мовы. Этыкет пры размове.

### *Тэма 12. Паводзінскі аспект этыкету*

Этыкет як асаблівая форма паводзін і спецыфічная форма рэгулядыі зносін людзей. Залежнасць этыкетных паводзін ад знакава-сэнсавых і сацыяльна-камунікатыўных сістэм. Разнастайнасць паводзінскіх структур у залежнасці ад стэрэатыпаў. Рэгламентацыя паводзін чалавека зводам законаў і правіл у традыцыйнай культуры. Вызначэнне паводзінскіх актаў прыналежнасцю да групы (пол, узрост, статус, пазіцыя).

Выражэнне паводзін праз манеры і ўчынкі. Паводзіны як сукупнасць стандартных і нестандартных паводзінскіх актаў.

### *Тэма 13. Функцыянаванне этыкету*

Матывацыя і матывіроўка ў этыкеце. Матывацыя як заахвочванне, якое выклікае актыўнасць этыкетных актаў. Праява ўнутраных інтарэсаў і патрэб праз матывацыю. Матывацыя як спосаб вызначэння дынамічных і структурных характарыстык этыкетных паводзін. Узаемасувязь няўстойлівых матываў паводзін і зносін з манерай паводзін. Фарміраванне этыкетных матываў і статус індывіда, яго роля, асабістыя пазіцыі і ўстаноўкі. Матывіроўка як форма тлумачэння сутнасці матывацыі. Суадносіны матывіроўкі і матывацыі - суадносіны сутнасці з'явы, факта з яго значэннем, трактоўкай.

Функцыянаванне этыкету як асэнсаванне і сінтэз інфармацыі аб зададзенай сітуацыі, валоданне яе ідэяй, вобразамі, іх рэалізацыяй, адпаведнымі сродкамі і дзеяннямі ў рамках пэўнай этыкетнай мадэлі.

### *Тэма 14. Этыкетныя ідэі, вобразы, архетыпы*

Ідэя як форма спасціжэння ў думцы з'яў аб'ектыўнай рэальнасці (Платон, Арыстоцель, Гегель, Х.Артэга-і-Гасет, М.Бахціна, Ф.Дастаеўскі пра ролю ідэі ў працэсе развіцця чалавека).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Роля вобраза ў вызначэнні спосабаў мыслення чалавека. Выражэнне праз ідэальныя якасці вобраза маральных, сацыяльных і этыкетных патрабаванняў.

Архетып высокай прэстыжнасці як сакральная фігура, шанаваны народам геній і вобраз героя, яго роля ў фарміраванні этыкетнай культуры. Рытуальна-сакральныя, палітыка-юрыдычныя і этыкетныя функцыі архетыпу высокай прэстыжнасці. Універсальныя рысы паводзін людзей з высокім статусам. Пазітыўны сэнс сядзення. Выражэнне павагі праз уставанне. Эвалюцыйная накіраванасць і семантычнае значэнне паклонаў. Метанімічнае значэнне "галавы". Глыбіня паклону: статус партнёраў і характар сітуацыі. Паслядоўнасць і матывіроўка паклонаў. Рытуалізаваныя паклоны. Рэлігійны і свецкі характар кленчання і распасцірання ніц. Хрысціянскі звычай кленчання. Выражэнне сацыяльных адносін праз кленчанне. Распасціранне па зямлі як рытуальная поза і выражэнне крайніх эмоцый.

### *Тэма 15. Асобы тып паводзін: рытуал, цырыманіял*

Рытуал як адна з форм сімвалічнага дзеяння, выказваючы сувязь суб'екта з сістэмай сацыяльных адносін і каштоўнасцей. Культавыя дзеянні як спосаб увасаблення і рэалізацыі ў вобразах пажаданага, пераважна быційнага факта. Прысутнасць таямніцы зносін з узвышанай ідэяй (жыцця, кахання, шлюбу, смерці) у рытуальных дзеяннях. Узвышэнне значнасці і пазітыўнай эмацыянальнасці жыцця ў розных рытуалах. Рэгламентацыя паслядоўнасці вербальных, рухальных, песна- пеўных актаў, устаноўкі на настрой, на вобраз прысутных у розных рытуалах. Эмацыянальна-псіхалагічны стан удзельнікаў рытуальных дзеянняў і арыентацыя на пэўныя тыпы ўзаемаадносін. Рытуальныя нормы і рэгламентацыя паўсядзённых форм этыкетнасці. Рытуал як аснова для ўстойлівых, ураўнаважаных, звыклых бытавых паводзін людзей. Роля рытуалу ў выяўленні, падтрымцы і абыгрыванні статусу ўдзельнікаў.

Цырыманіял - усталяваны парадак урачыстай справы. Суадносіны цырымоній з дзяржаўнымі і прыдворнымі рытуаламі і правіламі, з народнымі і грамадскімі звычаямі і традыцыямі. Асаблівасці богаслужэбных цырыманіялаў, прыдворных цырыманіялаў, цырымоній шлюбу; гарбатныя цырымоніі; цырымоніі прывітання, развітання; культ прычоскі, кветак, водараў; цырыманіяльны канон і рытуальны стыль. Цырыманіяльныя ідэі, вобразы і органы кіравання. Значэнне цырыманіялу ў зацвярджэнні норм і правіл этыкету. Сучасныя цырыманіялы. Пратакол.

### *Тэма 16. Мастацкі густ і этыкет*

Эстэтычны густ як аснова этыкетнай культуры. Эстэтычны светапогляд і этыкетны вопыт. Выхаванне мастацкага густу як адна з задач этыкетнай культуры. Сузіранні аб'ектаў прыгожага, радасць уласнага спасціжэння вобразаў прыгажосці і велічы духа, узораў культуры мінулага і сучаснасці і фарміраванне этыкетных узаемадзеянняў. Уплыў эстэтычных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

узораў і канонаў прыгожага ў гісторыі на паводзіны чалавека і акты зносін паміж людзьмі. Эстэтычны густ як здольнасць меркаванняў аб пачуццёвым увасабленні маральных ідэй.

І.Кант аб характары меркаванняў густу. Уплыў прыгожага на фарміраванне маральных пачаткаў у чалавеку. Развіццё ўменне атрымліваць эстэтычнае задавальненне ад мастацкіх узораў для развіцця ўстойлівага эстэтычнага густу, творчых адносін да жыцця, мастацтва, уласнай асобы. Выхаванне эстэтычнага густу ў працэсе зносін паміж людзьмі і з'явамі вышэйшага парадку: узвышанага, прыгожага, выдатнага, геніяльнага, гераічнага. Роля эстэтычнага густу для авалодання культурай этыкету ў тэорыі і на практыцы.

### *Тэма 17. Дзелавы этыкет*

Пошукі працы. Знешні выгляд. Гутарка з наймальнікам. Атрыманне работы. Праца. Правілы звароту на працы. Адносіны з калегамі. Прывітанне. Правілы ветлівасці на працы. Дзелавыя сустрэчы на працы. Адносіны паміж мужчынамі і жанчынамі на працы. Удзел у зборы сродкаў для іншых супрацоўнікаў. Звальненне. Звальненне з працы па ўласным жаданні. Рэкамендацыі. Пісьмовыя характарыстыкі. Службовае памяшканне. Правілы абсталявання працоўнага месца.

Этыкет камунікацый. Дзелавы тэлефон. Зняцце трубкі. Пачатак размовы. Змястоўнасць размовы. Спецыфіка тэлефон- ных зносін. Развітальныя словы. Размова з аўтаадказчыкам. Запрашэнне па тэлефоне. Мабільны тэлефон. Перапіска па факсе.

Дзелавая перапіска. Візітная картка. Дзелавое пісьмо. Асабісты ліст. Рэкамендацыйны ліст. Падзячныя лісты. Віншавальныя лісты. Паштоўка. Тэлеграма. Факс і электронная пошта.

Прэзентацыя і публічныя выступлении Прамова. Адказы на пытанні. Выступленні па радыё і тэлебачанні.

Дзелавыя сустрэчы. Прэзентацыі. Арганізацыя і правядзенне афіцыйных нарад, сходаў і сустрэч. Арганізацыя харчавання ўдзельнікаў сустрэч. Правядзенне дзелавых сустрэч у хатняй абстаноўцы.

Этыкет перамоў. Вядзенне перамоў. Змест перамоў. Атмасфера перамоў. Метады вядзення перамоў.

Прыёмы. Віды прыёмаў: барбекю, бранч, кактэйль, ленч, пікнік, фуршэт, гарбата. Афіцыйны прыём. Запрашэнне і адмова ад запрашэння. Прыход на прыём. Рассаджванне за сталом. Адзенне для прыёму. Музыка на прыёме. Хатнія прыёмы. Госці. Нечаканы госць. Далёкія сваякі. Замежныя госці. Вы ў гасцях.

### *Тэма 18. Адзенне і этыкет*

Дынаміка змянення адзення як працэс узаемадзеяння людзей і прыроды, сістэмы рэлігійных культаў і этнакультур, сацыяльна-групавых адносін. Асноўныя прыкметы адзення ў перыяд старажытных культур (Старажытны Егіпет, Асірыя, в. Крыт). Асаблівыя рысы адзення Антычнай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эпохі (з'яўленне першага афіцыйнага дрэс-кода). Сацыяльная значнасць адзення Сярэднявечча. Звычайнае і святочнае царкоўнае адзенне. Адзенне карнавальнага тыпу. Адносіны да агалення ў розных народаў. Адзенне славян. Сімвалічныя, практычныя і эстэтычныя функцыі галаўных убораў. Прычоска і правілы этыкету. Дэндзізм як стыль жыцця з асобымі патрабаваннямі да адзення і стылю паводзін.

Універсальнасць і дэмакратычнасць сучасных уяўленняў аб адзенні, залежнасць ад сацыяльных пазіцый, індывідуальнага стылю і законаў моды. Функцыі адзення (падтрыманне тэмпературнага рэжыму, знакавая, сімвалічная, карэкціруючая і дэманстратыўная, адлюстраванне часу і эпохі). Імідж як форма самапрэзентацыі і адзення. Узроўні іміджу - габітарны, кінестэтычны, асяродкавы. Імідж і асацыятыўныя паводзіны. Дзелавое адзенне. Знешняе аблічча жанчыны. Знешні выгляд мужчыны.

### *Тэма 19. Этыкет гасціннасці*

М.Маас аб механізмах абмену і дарэння. Парадаксальнасць архаічнага дару. Рытуалізацыя і міфалагізацыя прыёму госця ў розных народаў. Л.Я.Штэнберг пра гасціннасць. Трапеза - семантыка і агульныя прынцыпы арганізацыі: наяўнасць гасцявых дамоў, становішча цела ў час трапезы, наяўнасць крэслаў, стол як сакральны цэнтр жылля, наяўнасць ачага, печы, чырвонага вугла.

Рассаджванне за сталом. Парадак рассаджвання як выяўленне субардынацыі сатрапезнікаў. Рассаджванне - мадэль полаўзроставай і сацыяльнай стратыфікацыі калектыву.

Паводзіны за сталом. Як правільна сядзець за сталом. Калі прыступаць да ежы. Адмова ад прапанаванай стравы. Выхад з цяжкай сітуацыі за сталом. Што і як ядуць. Спалучэнне страў і напояў. Правілы абыходжання з рознымі стравамі. Чым частаваць замежных гасцей. Напоі для стала. Што і як п'юць.

### *Тэма 20. Этыкет на кожны дзень*

Правілы зносін. Прывітанне. Прадстаўленне. Зварот. Прабачэнне.

Паводзіны ў грамадскіх месцах: тэатр, канцэрт, вернісаж, кафэ, рэстаран. Наведванне ўстаноў. Гасцініцы, пансіянаты, санаторыі, гатэлі. Наведванне магазінаў. Наведванне хворых. Паводзіны на вуліцы. Сустрэчы на вуліцы.

У транспарце. Грамадскі транспарт. Цягнік. Міжнародны аўтобус. Самалёт. Аўтамабіль.

Падарункі. Падарункі ў свецкім і дзелавым жыцці. Прычыны, па якіх прынята рабіць падарункі. Як выбраць падарунак: дарэчныя і недарэчныя падарункі, непажаданыя пада- рункі. Грошы ў якасці падарунка. Правілы ўручэння і прыёму падарунка. Упакоўка падарункаў. Падарункі на прыёмах. Удзячнасць за падарункі. Кветкі ў якасці падарунка. Адказ ад падарунка.

Этыкет сямейных адносін. Правілы ўзаемаадносін паміж бацькамі. Дзеці і этыкет.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 21. Нацыянальны характар і этыкет*

Нацыянальны характар як адлюстраванне гістарычнай рэчаіснасці. Этас як сістэма пануючых каштоўнасцей і норм паводзін. Культура быту як адлюстраванне нацыянальных традыцый. Асаблівасці нацыянальнага этыкету. Паняцце этнарыторыкі.

Паводзінскія стэрэатыпы як сфарміраванасць мадэляў сацыяльнага вопыту, адладжаных актаў узаемадзеяння чалавека з асяроддзем пражывання, звыкласць, узгодненасць асобных паводзінскіх манер. Паводзінскія стэрэатыпы і этыкет.

Норавы як выраз агульных уласцівасцей чалавека і народа. Звычкі, жыццёвыя правілы, звычаі, манеры і выкананне абавязкаў, схільнасць да любові, міласэрнасці як праява нораваў. Сацыяльныя групы, класы і норавы.

Патрабаванні нацыянальнага этыкету ў розных краінах. Правілы міжнароднай ветлівасці. Паводзіны за мяжой. Сучасныя тэндэнцыі ў развіцці этыкетнай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
(дзённае аддзяленне)

| № раздзела, тэмы | Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | | |
| **1.** | **Уводзіны** | 1 | | | |
| **2.** | **Тэма 1.** Этыкет у краінах Пярэдняй Азіі і Старажытнага Егіпта | 1 | | 1 | Абмеркаванне вынікаў індывідуальных заданняў |
| **3.** | **Тэма 2.** Этыкет Антычнай эпохі | 1 | | | |
| **4.** | **Тэма 3.** Знакі і жэсты Сярэднявечча | 1 | | | |
| **5.** | **Тэма 4.** Еўрапейскі этыкет XVI-XIX ст. стагоддзяў | 1 | | 1 | Абмеркаванне вынікаў індывідуальных заданняў |
| **6.** | **Тэма 5.** Этыкет савецкага грамадства | 1 | | | |
| **7.** | **Тэма 6.** Беларускі этыкет | 1 | 1 | | |
| **8.** | **Тэма 7.** Этыкет краін Усходу | 1 | 1 | 1 | Абмеркаванне вынікаў індывідуальных заданняў |
| **9.** | **Тэма 8.** Амерыканскі этыкет | 1 | 1 | | |
| **10.** | **Тэма 9.** Сучаснасць і этыкет | 1 | 1 | | |
| **11.** | **Тэма 10.** Семіятычны аспект этыкету | 1 | 2 | | |
| **12.** | **Тэма 11.** Камунікатыўны аспект этыкету | 1 | 1 | | |
| **13.** | **Тэма 12.** Паводзінскі аспект этыкету | | 2 | | |
| **14.** | **Тэма 13.** Функцыянаванне этыкету | 1 | | | |
| **15.** | **Тэма 14.** Этыкетныя ідэі, вобразы, архетыпы | 1 | | 1 | Абмеркаванне вынікаў індывідуальных заданняў |
| **16.** | **Тэма 15.** Асобы тып паводзінаў: рытуал, цэрыманіял | 1 | | | |
| **17.** | **Тэма 16.** Мастацкі густ і этыкет | 1 | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **18.** | **Тэма 17.** Дзелавы этыкет | | 1 | | |
| **19.** | **Тэма 18.** Адзенне і этыкет | | 1 | | |
| **20.** | **Тэма 19.** Этыкет гасціннасці | | 1 | 1 | Абмеркаванне вынікаў індывідуальных заданняў |
| **21.** | **Тэма 20.** Этыкет на кожны дзень | | 1 | | |
| **22.** | **Тэма 21.** Нацыянальны характар і этыкет | | 1 | 1 | дыскусія |
| | **Разам…** | **16** | **12** | **6** | |

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
(завочнае аддзяленне)

| № раздзела, тэмы | Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі |
| **1.** | **Уводзіны** | 1 | |
| **2.** | **Тэма 1.** Сучаснасць і этыкет | 1 | |
| **3.** | **Тэма 2.** Этыкетныя ідэі, вобразы, архетыпы | 1 | |
| **4.** | **Тэма 3.** Семіятычны аспект этыкету | 1 | |
| **5.** | **Тэма 4.** Паводзінскі аспект этыкету | 1 | |
| **6.** | **Тэма 5.** Дзелавы этыкет | | 1 |
| **7.** | **Тэма 6.** Адзенне і этыкет | 1 | |
| **8.** | **Тэма 7.** Нацыянальны характар і этыкет | | 1 |
| | **Разам…** | **6** | **2** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА–МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

*Асноўная*

1. *Байбурин, А.К.* У истоков этикета: Этнографические очерки / А.К.Байбурин, А. А.Топорков. – Л.: Наука, 1990. – 166 с.

2. *Беларусы:* Вытокі і этнічнае развіццё / В.К.Бандарчык, В.М.Бялявіна, Г.І. Касяровіч і інш.; НАНБ. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мн.: Бел. Навука, 2001. – 433 с.

3. *Беларусы:* Сям'я / В.К.Бандарчык, В.М.Бялявіна, Г.І.Каспяровіч і інш.; НАНБ. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мн.: Бел. Навука, 2001. – 375 с.

4. *Босрок, М.М.* Путеводитель по обычаям и этикету. Европа / М.М.Босрок . – М.: АСТ: Астрель, 2007. – 415 с.

5. *Большая* книга по этикету. – Мн.: Харвест, 2004. – 712 с.

6. *Деловое* общение : учебное пособие / авт.-сост. И. Н. Кузнецов. – Москва : Дашков и К°, 2018. – 524 с. ; То же [Электронный ресурс]. – URL:http://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=496102.

7. *Дьяченко, Е. И.* Этикет и культура поведения / Е. И. Дьяченко. – М. : МСХА, 1994. – 208 с.

8. *Кондаленко, Л.К.* Культура этикета: Пособие для педагогов / Л.К.Кондаленко, С.М.Симонова. – Мн.: Бел. навука, 2002. – 293 с.

9. *Кузнецов, И.Н.* Деловой этикет: учеб. пособие для студентов вузов / И. Н. Кузнецов. – М. : ИНФРА-М, 2013. – 348 с.

10. *Кузнецов, И. Н.* Современный этикет / И.Н. Кузнецов. – Москва : Дашков и К°, 2018. – 496 с. ; То же [Электронный ресурс]. – URL:http://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=496072.

11. *Курочкина,И.Н.* Этикет в нашейжизни: исторический и методичес кий аспекты / И.Н. Курочкина, Т.В. Черник. – М.: Просвещение, 1994. – 170 с.

12. *Мерцалова, М.Н.* Костюм разных времен и народов : В 4 т. / М. Н. Мерцалова. – Москва : Академия моды, 1993. – 4 т.

13. *Одинцова, О.В.* Профессиональная этика: учебник для студентов вузов / О. В. Одинцова. - 3-е изд., стер. – М.: Академия, 2014. – 144 с.

14. *Соловьев, Э.Я.* Современный этикет и деловой протокол / Э.Я.Соловьев. – М. : Ось-89, 2000. – 208 с.

15. *Этика* / под общ. ред. А.А. Гусейнова. – М.: Издательство Юрайт, 2015. – 569 с.

16. *Этикет.* Современная энциклопедия. – М.: Издательство Астрель, 2007. – 407 с.

*Дадатковая*

1. *Бороздина, Г. В.* Психология и этика деловых отношений : учебное пособие / Г. В. Бороздина. – Минск : РИПО, 2015. – 228 с. ; То же

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[Электронный ресурс]. – URL: http://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=463538.

2. *Гальперина, Г.А.* Язык подарков. Все тонкости этикета / Г.А. Гальперина. – М.: ЗАО Центрполиграф, 2007. – 191 с.

3. *Грасиан, Б.* Карманный оракул / Б.Грасиан. – М.: ЭКСМО-Пресс, 1999. – 384 с.

4. *Дьяконов, И.М.* Эпос о Гильгамеше / И.М.Дьяконов. – СПб.: Наука, 2006. – 214 с.

5. *Калачова, І. І.* Сям'я і шлюб беларусаў у гістарычнай рэтраспектыве і перспектыве / І. І. Калачова. – Мінск : РІВШ, 2015. – 143 с.

6. *Кант, И.* Критика чистого разума / И.Кант. – М.: Мысль, 1994. – 591с.

7. *Касцюкавец, Л.П.* Беларускія народныя абрады / Л.П.Касцюкавец. – Мн.: Беларусь, 1994. – 69 с.

8. *Крук, Я.* Колесо времени: традиции и современность / Я.Крук, О.Котович. – Минск: Беларусь, 2010. – 350 с.

9. *Кузнецов, И. Н.* Современный язык жестов / И.Н. Кузнецов. – М.: АСТ, Харвест, 2012. – 448 с.

10. *Лихачев, Д. С.* Сочинения князя Владимира Мономаха / Д.С.Лихачев. – М.: Наука, 2001. – 164 с.

11. *Лосев, А.Ф.* Бытие - Имя - Космос / А.Ф.Лосев. – М.: Мысль, 1993. – 958 с.

12. *Михалькевич, Г. Н.* Протокол и этикет международного общения : учебное пособие для студентов вузов по специальностям "Международные отношения", "Международное право", "Международная журналистика" / Г. Н. Михалькевич. – Минск : РИВШ, 2012. – 265 с.

13. *Мунин,* А. Н. Деловое общение: курс лекций : учебное пособие / А. Н. Мунин. – Москва : Флинта, 2016. – 376 с. ; То же [Электронный ресурс]. – URL: http://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=83389.

14. *Пиз, А.* Как читать мысли окружающих по их жестам / А. Пиз ; пер. с англ. Т. Новиковой. – М. : Эксмо, 2005. – 448 с.

15. *Правила* светской жизни и этикета. – М. : Рипол, 1991. – 416 с.

16. *Сопер, П.* Основы искусства речи / П.Сопер. – М.: Прогресс; Прогресс-Академия, – 1992. – 416 с.

17. *Токарев, С. А.* Религия в истории народов мира.— 4-е изд., испр. и доп. — М.: Политиздат, 1986. – 354 с.

18. *Философский* энциклопедический словарь / Л.Ф.Ильичёв, П.Н.Федосеев, С.М.Ковалёв, В.Г.Панов. — М.: Сов. Энциклопедия, 1983. – 840 с.

19. *Формановская, Н. И.* Культура общения и речевого поведения : учебное пособие / Н. И. Формановская. – М. : ИКАР, 2010. – 114 с.

20. *Фрэзер,* Дж. Золотая ветвь: Исследование магии и религии / Пер. с англ. М.К. Рыклина. М.: АСТ, 2006. – 781 с.

21. *Хёйзинга, Й.* Осень Средневековья. Соч. в 3-х тт. Т. 1. / Й.Хёйзинга. - М.: Издательская группа "Прогресс" - "Культура", 1995. – 416 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

22. *Честерфилд*. Письма к сыну / Честерфилд. - М.: Знание, 1991. - 63 с.
23. *Эстетика*: учеб. пособие / В.Ф.Мартынов. - Мн.: ТетраСистемс, 2004. – 336 с.
24. *Этнаграфія* Беларусі: энцыкл. - Мн.: БелСЭ, 1989. – 575 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае работу з навуковай, навукова-папулярнай, вучэбна-метадыч-най, хрэстаматыйнай літаратурай, вывучэнне студэнтамі асобных пытанняў дысцыпліны, аналіз канкрэтных сітуацый, падрыхтоўку да семінарскіх заняткаў, заліку і экзамену.

Пры вывучэнні дысцыпліны выкарыстоўваюцца наступныя віды самастойнай работы студэнтаў:

- пазааўдыторная, у тым ліку кіруемая самастойная работа;
- аўдыторная (кантралюемая) самастойная работа;
- творчая, у тым ліку навукова-даследчая работа.

### Формы выкавання самастойнай работы:

- напісанне рэферата;
- распрацоўка візуальнай прэзентацыі;
- пісьмовае выкананне індывідуальных заданняў;
- пісьмовае выкананне кантрольных работ;
- падрыхтоўка да ўдзелу ў навуковых і навукова-практычных канферэнцыях, семінарах і круглых стадах.

### Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

Для ацэнкі дасягненняў па вучэбнай дысцыпліне «Этыкет і культура быту» і дыягностыкі фарміравання кампетэнцый студэнтаў выкарыстоўваецца наступны дыягнастычны інструментарый:

- удзел студэнта і выступление яго на семінары з падрыхтаваным інфармацыйным (тэматычным) паведамленнем і інш.;
- абарона заданняў, выкананых на семінарскіх занятках;
- падрыхтоўка рэфератаў па асобных тэмах;
- абарона выкананых у рамках кіруемай самастойнай работы індывідуальных (групавых) заданняў;
- вусныя бягучыя кантрольньм апытанні па асобных тэмах падчас заняткаў;
- залік па дысцыпліне.

### Рэкамендаваяыя метады (тэхналогіі) навучання

Да эфектыўных педагагічных тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца:

- тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;
- тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;
- праектныя тэхналогіі;
- камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусія, прэс-канферэнцыі, вучэбньм дэбаты і іншыя актыўныя формы і метады);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- гульнявьм тэхналогіі, у межах якіх студэнты ўдзельнічаюць у дзелавых, ролевых, імітацыйных гульнях і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ